ступалі к свайму вянцу. З імі ў царкву ехалі толькі хросныя бацька і матка, дружка і друг. Маладым слалі пад ногі палаценца і на рагі клалі грошы, каб маладыя былі багатымі» (запісана ў в. Чырвоны Бераг ад Гурчанка Вольгі Сяргееўны, 1964 г. н.).

Паслявясельную частку ў в. Чырвоны Бераг таксама адзначалі: «Але вяселле яшчэ не заканчваецца. На другі дзень у госці да бацькоў нявесты ідуць у адведкі сваякі жаніха з маладымі. На наступны дзень ужо бацькі нявесты ідуць у адведкі ў хату маладога» (в. Чырвоны Бераг) [1, с. 138]. Паслявясельная частка мела назву «*Петухі*». Паводле сведчанняў жыхароў, выбіралі маладых, якіх апраналі наадварот і якія з гасцямі хадзілі па дварах аднавяскоўцаў, дзе ім давалі «куру» або «петуха»: «Убіраюць маладых: маладога – у дзеўку, маладую – у хлопца і ходзяць па дварах. І гаспадар, к якому завітаюць госці, павінен даць куру ці петуха» (в. Чырвоны Бераг) [1, с. 139]. Як правіла, госці пераапраналіся «ў цыган»: «Госці – жанчыны і мужчыны – прыбіраюцца ў цыган» (в. Чырвоны Бераг) [1, с. 139].

Такім чынам, прыведзеныя матэрыялы па вясельнай абраднасці Жлобінскага раёна Гомельскай вобласці яскрава дэманструюць асаблівасці мясцовай вясельнай традыцыі в. Чырвоны Бераг.

**Спіс літаратуры**

1 Вясельная традыцыя Гомельшчыны: фальклорна-этнаграфічны зборнік / укладанне В. С. Новак; Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны. – Мінск; Права і эканоміка, 2011. – 485 с.

2 Вяселле на Гомельшчыне: фальклорна-этнаграфічны зборнік. – ЛМФ «Нёман», 2003. – 472 с.

*УДК 392.1(476.2-37 Хойнікі)*

**Х. В. Бусева**
***Навук. кір. – В. С. Новак, д-р філал. навук, прафесар***

## ТРАДЫЦЫІ РАДЗІННА-ХРЭСЬБІННАЙ АБРАДНАСЦІ ХОЙНІЦКАГА РАЁНА ГОМЕЛЬСКАЙ ВОБЛАСЦІ

*Артыкул прысвечаны характарыстыцы радзінна-хрэсьбіннай абраднасці Хойніцкага раёна. Былі прааналізаваны структурныя кампаненты традыцыйнага радзінна-хрэсьбіннага абрадавага*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

*комплексу Хойнікшчыны і выяўлены мясцовыя асаблівасці кожнага з іх, а таксама прыкмет і павер'яў, арганічна звязаных з імі.*

Беларуская радзінна-хрэсьбінная абраднасць мае адметную складзеную на працягу шматлікіх стагоддзяў згодна структуру. Сярод розных структурных кампанентаў можна вылучыць такія класічныя моманты, як міфалагічныя ўяўленні, звязаныя з цяжарнасцю жанчыны і нараджэннем дзіцяці, адведкі, запрашэнне бабкі-павітухі і выбар кумоў, царкоўны абрад хрышчэння; хрэсьбіннае застолле, адорванне маці-парадзіхай бабкі і кумоў, абрад разбівання гаршка з кашай, падзел бабінай кашы і частаванне ўсіх удзельнікаў хрэсьбін, абрад адвозіць бабку-павітуху дадому, выкананне радзінна-хрэсьбінных песень.

Даследаванне мясцовай спецыфікі радзінна-хрэсьбінных абрадаў Хойніцкага раёна надзвычай важна для асэнсавання агульнаэтнічнай традыцыі святкавання хрэсьбін. Нашы продкі здаўна прытрымліваліся ўстойлівых правіл і прадпісанняў, выпрацаваных у пакаленнях для забеспячэння паспяховых родаў цяжарнай жанчыны, здароўя жанчыны-парадзіхі і немаўля. Асобныя (іншы раз нават жорсткія) правілы і забароны для цяжарнай жанчыны абумоўлены верай у тое, што яе дзеянні маглі пэўным чынам адбіцца на знешнім выглядзе нованароджанага, асаблівасцях нораву, будучым лёсе.

Ахарактарызуем асобныя кампаненты ў сістэме мясцовай радзінна-хрэсьбіннай абраднасці. Спачатку звернем увагу на народныя вераванні, звязаныя з цяжарным станам жанчыны. Даследчыкі, як правіла, абапіраючыся на фактычны матэрыял, вылучаюць некалькі функцыянальных груп міфалагічных уяўленняў, адлюстраваных у прыкметах і павер'ях. Найбольшай па колькасці групай запісаў з'яўляюцца скіраваныя на засцярогу цяжарнай жанчыны ад тых дзеянняў, якія могуць нашкодзіць знешняму выгляду дзіця: «*Калі цяжарная ішла на пахараны, яна прывязвала да пояса чырвоную лентачку ці чырвоную хустку, каб не прычынілася ліхога. Цяжарная павінна насіць увесь час хвартух, тады дзіця не будзе баяцца благога вока. Каб людзі не ўраклі, цяжарная, як ідзе ў людзі, павінна апранаць ўсё да пары: пару сарочак, пару спадніц і г. д. Тады ніхто не ўрачэ. Калі цяжарная спужаецца каго-небудзь, то павінна заткнуць за пояс вялікі палец левай рукі*» (в. Аравічы) [1, с. 119].

Як толькі нараджалася дзіця, жыхары Хойнікшчыны прыходзілі ў адведкі да жанчыны-парадзіхі. Звычайна яе наведвалі ў першыя 2-3 дні. Гэты звычай захаваўся да нашых дзён, але адбыліся ў дадзенай традыцыі пэўныя змены: сёння, разам з жанчынамі, у адведкі ідуць і мужчыны, і незамужнія дзяўчаты, якія звычайна прыносяць

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

гасцінцы жанчыне-парадзісе і нованароджанаму: «*Хто родзіць дзіця, дык сабіраюцца тады бабы і ідуць даведацца. Бралі міску мукі, крупу, ілі сухароў напякуць, ілі якога малака вольмуць, ну што было. Прыходзяць сюды, етая рожаніца саджае за стол. Там іх сабярэцца пяць-шэсць, а можа, і болей. Вуп'юць, тады закусяць, трохі пагуляюць і пайшлі дадому. Ета былі так называемыя вотведы»* (в. Алексічы) [1, с. 122].

Абраду выбару хросных бацькоў, прысутнасць якіх была абавязковай падчас царкоўнага абраду хрышчэння дзіцяці, надавалася вялікае значэнне. Абавязкова, калі ішлі іх запрашаць да ўдзелу ў хрэсьбінах, бралі хлеб: «*Хросных выбіралі абавязкова. Бацькі самі выбіралі іх і ішлі з хлебам да кумы і кума. Калі кумаўя згаджаліся хрысціць дзіця, тады хлеб забіралі. Калі згоды не было, то хлеб не бралі*» [1, с. 126].

У некаторых вёсках Хойніцкага раёна хрысцілі дзіця адразу ж на другі дзень пасля яго нараджэння: «*Ета ж зараз доўга не хрысцяць, а тады – сёння родзіцца, а назаўтра і хрысцяць* (в. Дворышча) [1, с. 118]. Асноўныя дзеянні абраду хрышчэння ўключалі наведванне царквы, чытанне малітвы, абмыванне дзіцяці святой вадой. Лічылася, што гэта абароніць немаўля ад ўздзеяння звышнатуральных сіл, ад «дурнога вока». Было надзвычай важна абмыць дзіця святой вадой: яго «*умывалі свянцонай вадой»* (г. Хойнікі) [1, с. 125].

Бацькі нованароджанага не ўдзельнічалі ў абрадзе царкоўнага хрышчэння, гэтую функцыю выконвалі толькі хросныя бацькі: «*Як хрысцілі, то ў цэркву матак не бралі. Ішлі толькі хросны, хросная, бацька. Рожаніца ў цэркву дванаццаць дней не хадзіла. Хрысцяць дзіця, у ваду апускаюць. Тады ўжэ крэсціка вешаюць, перахрысціць бацюшка, і дадому едуць»* (в. Небытаў) [1, с. 123]. Калі хрысцілі дзіця, то назіралі за дзеяннямі святара, які састрыгаў «*у дзіцяці валосікі, то кум капае на іх воскам і кідае ў купель. Калі валасы адразу патонуць, то дзіця скора памрэ, а як будуць наверсе плаваць, то дзіця будзе шчасліваe»* [1, с. 119]. З прыведзенага апісання вынікае, як нават падчас абраду хрышчэння імкнуліся прагназаваць лёс нованароджанага.

Звычайна ў вёсках Хойніцкага раёна заўсёды спраўляюць хрэсьбіны, падчас якіх абавязкова выконвалі песні, адрасаваныя маці нованароджанага, бабцы і кумам, а таксама госці адорвалі падарункамі жанчыну-парадзіху і дзіця: «*Потым пачынаецца застолле. Госці гуляюць, пяюць песні парадзіхе, бабцы, кумам, дзіцяці і проста песні. Дзіця адорвалі тады, як была каша (лажылі на кашу, ці грошы, ці адзёжкі). Парадзіхе госці дарылі грошы, як прыходзілі ў хату* (в. Аравічы) [1, с. 119].



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Менавіта на хрэсьбінах адорвалі таксама і кумоў, і бабку-павітуху, якая прыносіла гаршчок з падрыхтаванай ёю кашай. На Хойнікшчыне гаршчок з кашай разбіваў кум, ад якога патрабавалася пакласці больш грошай за іншых удзельнікаў свята: «*Хто даваў болей грошай, той і кашу забірае, но тады ўсё раўно етую кашу ўсе ядзяць. Но такі закон, што хто-та доўжан яе выкупіць. Абязацельна доўжэн кум купіць сваю кашу, ну ці кума, ета няма разніцы*» (в. Алексічы) [1, с. 122].

Галоўным абрадавым атрыбутам хрэсьбіннага святкавання, як адзначалася ўжо вышэй, была абрадавая страва (каша), якую рыхтавала бабка-павітуха. У вёсках Дворышча, Маклішча, Алексічы, як сведчыць фактычны матэрыял, рыхтавалі кашу і кум, і кума, і бабка-павітуха: «*Гатавалі кашу, якая была галоўным атрыбутам хрэсьбін. Кашу гатавалі кума, кум і бабка-павітуха*» (г. Хойнікі) [1, с. 126]; «*У нас абычна варылі кум, кума і баба*» (Алексічы) [1, с. 122].

Менавіта падзелам абрадавай кашы завяршаліся хрэсьбіны. Чарапкі ад гаршка з кашай, які разбівалі, лічылі магічнымі. Верылі, што яны паўплываюць на нараджэнне дзіцяці ў будучым, таму і імкнуліся пакласці іх на галовы нежанатых хлопцаў і незамужніх дзяўчат: «*Бабка збірае чарапкі і ложыць нежанатым на галаву, каб хутчэй ажаніліся, а каша так і стаіць, і не рассыпаецца. Гэта добры знак, значыць, дзіцятка будзе жыць доўга і багата*» (в. Аравічы) [1, с. 120]. У в. Вялікі Бор чарапкі ад гаршка кідалі на парог, каб дзіця было фізічна моцным: «*Як разбілі кашу, чарапкі кідалі ў парог, штоб было дужэйшае дзіця*» [1, с. 121].

У некаторых вёсках Хойніцкага раёна захавалася цікавая традыцыя: рабіць падманную кашу: «*Абавязкова варылі кашу, варылі яе з пшана. Таксама была і падманная каша, куру паднасілі ў гаршку. Казалі: «Бач якую баба кашу прынесла», да смяяліся. Курыцу ці ката ў гаршок пасадзяць, накрыюць. Шуцяць, а тады ўжэ нясуць кашу нармальную*» (в. Небытаў) [1, с. 124].

Напыканцы хрэсьбіннага застолля адбываўся абрад «адвозіць» бабку-павітуху дадому. Таксама адвозіць маглі не толькі яе, а яшчэ і кумоў: «*Калі пачыналі расходзіцца, то бабу адвозілі на санках (калі зіма) або на калясцы дадому. Там іх баба частавала*» (в. Віць) [1, с. 121]; «*Назаўтра, уранні, мы прыходзім, чуць пасядзелі за сталом, перавярнулі барану, пасадзілі бабу і пацягнулі. Потым бяруць каляску на два калясы, ложаць кажуха, садзяць куму і цягнуць*» (в. Бялёў) [1, с. 125].

Такім чынам, як сведчыць фактычны матэрыял, радзінна-хрэсьбінныя абрады мелі важную ролю у жыцці і побыце беларусаў. Яны і сёння ўстойліва бытуюць як у вясковым, так і ў гарадскім асяроддзі. Радзінна-хрэсьбінныя абрады і звычаі Хойніцкага раёна

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Гомельскай вобласці адрозніваюцца адметнымі рысамі, якія можна выявіць як у асобных абрадавых дзеяннях, так і ў адпаведных песнях.

## Спіс літаратуры

1 Хойнікшчыны спеўная душа: народная духоўная культура Хойніцкага краю: фальклорна-этнаграфічны зборнік / Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Хойніцкі раённы выканаўчы камітэт, Установа адукацыі "Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф. Скарыны", Дзяржаўная навуковая ўстанова "Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі". – Мінск: Выдавецкі цэнтр БДУ, 2010. – 302 с.

*УДК 392.5(476.2-37Брагін)*

**В. А. Дзешча**

***Навук. кір. – В. С. Новак, д-р філал. навук, прафесар***

# ВЯСЕЛЬНАЯ АБРАДНАСЦЬ ВЁСКІ КІРАВА БРАГІНСКАГА РАЁНА ГОМЕЛЬСКАЙ ВОБЛАСЦІ: МЯСЦОВАЯ СПЕЦЫФІКА

*Артыкул прысвечаны характарыстыцы традыцый вясельнай абраднасці вёскі Кірава Брагінскага раёна Гомельскай вобласці. Аўтар на багатым фактычным матэрыяле, уласна запісаным і архіўным, выяўляе адметныя лакальныя рысы мясцовага вясельнага абраду, засяроджвае ўвагу на абрадавых этапах і звязаных з імі народных вераваннях.*

Вяселле – гэта старажытнае свята, якое адзначаецца ў кожнага народа і мае свае адметныя этнічныя рысы. Звесткі па вясельнай абраднасці можна запісаць і сёння, бо ўстойлівасць іх захавання абумоўлена тым, што яны здаўна перадаваліся з пакалення ў пакаленне. Вядома, што вяселле адзначалася на працягу некалькіх дзён. Звернемся да характарыстыкі вясельнай абраднасці вёскі Кірава Брагінскага раёна і засяродзім увагу на асобных абрадавых этапах, сярод якіх адным з першых па часе абрадавым момантам было сватанне. Паводле сведчанняў жыхаркі в. Кірава Брагинскага раёна Каляды Надзеі Іванаўны, 1931 г. н., «*перад вяселлем бацькі жаніха адпраўлялі сватоў ў дом будучай нявесты. Звычайна сватаць ішлі*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ